Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
15 СНЕЖНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №242 (28606)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Хто і як стварае пазітыўную раніцу на ТБ

СТАР. 5



Цікавыя гісторыі нашых чытачоў

СТАР. 13



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ, міністр інфармацыі:**

*«Інфармацыйная бяспека па сваёй змястоўнай сутнасці — вельмі простае паняцце: засцерагчы ўсіх, хто карыстаецца інфармацыяй, ад уплываў, патокаў, якія імкнуцца перавярнуць свет. Пытанне аб неабходнасці стварэння бяспекі на медыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы рытарычнае. Адзіная інфармпрастора можа спрыяць умацаванню бяспекі Саюзнай дзяржавы, бяспекі і Беларусі, і Расіі. Для гэтага ў нас ёсць цэлая лінейка не проста дзяржаўных СМІ (як у Беларусі, так і ў Расіі), не проста грамадскіх, прыватных сродкаў масавай інфармацыі ў нашых дзяржавах, але і цэлая лінейка інтэграцыйных масмедыя, якія ўжо завявалі аўтарытэт у свайго гледача, падпісчыка, чытача».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.12.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0277 | ▼ |
| Еўра | 2,3963 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0345 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0739 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Казкі старога млына



Фота БЕЛТА.

**Млын у вёсцы Дварышча Лідскага раёна, пабудаваны ў XIX стагоддзі, яшчэ нядаўна ўяўляў сабой адны тоўстыя старыя сцены. Пасля таго як аб'ект нерухомасці быў выстаўлены на аўкцыён, яго набыла турыстычная фірма Генадзя Конана. Адрэстаўраваўшы стары будынак, максімальна захаваўшы яго аўтэнтычнасць, цяпер тут плануюць зрабіць музей з тэматычнымі экспазіцыямі. У гэтым памяшканні, дзе Яўген ЖЫГАЛА і Артур ЧАРНЮК устанаўліваюць фігуру рыцара, будзе расказвацца пра эпоху Сярэднявечча.**

■ Традыцыі

## ПА РЭЦЭПТАХ БАБУЛЬ

### Як звычайная віцебская школа можа стаць цікавым турыстычным аб'ектам



**Свята беларускай кухні ў віцебскай сярэдняй школе №29 імя В. В. Піменава з цягам часу перарастае рамкі школьнага. Калі на сталы тут нясуць з навакольных дамоў дранікі, свойскую каўбасу, мачанку і верашчаку, калдуны, клёцкі, бульбяную бабку і падобнае, то, вядома, ніводная сям'я, дзе ёсць вучань з гэтай школы, не застаецца ўбаку.**

СТАР. 4

■ Руплівым гаспадарам

## МІСІЯ: ДАЖЫЦЬ ДА ВЯСНЫ,

### або Колькі можа пратрымацца беларускі яблык?

**Дзякуючы рабоце селекцыянераў сёння спажывец можа купляць айчынныя яблыкі круглы год. Асобныя сарты здольныя ляжаць да вясны. Але, каб захаваць ураджай як мага даўжэй, трэба ведаць пэўныя сакрэты. І беларускія вучоныя гатовы імі падзяліцца.**



Навуковы супрацоўнік аддзела захоўвання і перапрацоўкі Галіна НОВІК.

Мы завіталі ў аддзел Інстытута пладаводства НАН Беларусі, які займаецца распрацоўкай і ўдасканаленнем тэхналогій захоўвання пладовых і ягадных культур. У доследных камерах тут сёння можна ўбачыць некалькі сартоў яблыкаў. Справа ў тым, што для розных пладоў патрабуюцца неаднолькавыя ўмовы. Нават тэмпературу трэба падбіраць «індывідуальна». Так, калі адным сартам ідэальна падыдзе чатыры градусы, іншым трэба яшчэ менш. У інстытуце назіраюць за тым, як сябе паводзяць плады і ў звычайнай атмасферы, і ў рэгуляваным газавым асяроддзі. У асобных модулях можна задаваць умовы з розрай колькасцю кіслароду і вуглякіслага газу.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПАДПІШЫСЯ — І ВЫІГРАЙ ГАЗАВУЮ ПЛІТУ ЦІ МІКРАХВАЛЁЎКУ!
Працягваецца падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!
КУПОН ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ на 5-й стар.